**Галаскокаў, В.** «Помню цябе, Афганістан…» / В. Галаскокаў // Патрыёт (Ушачы). — 1988. — 9 лют. — С. 2.

**«ПОМНЮ ЦЯБЕ, АФГАНІСТАН…»**

***Райваенком Валерый Дзмітрыевіч Галаскокаў выконваў інтэрнацыянальны доўг у саставе абмежаванага кантынгенту савецкіх войск у Дэмакратычнай Рэспубліцы Афганістан, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і афганскім ордэнам Славы. Сёння мы прапануем чытачам расказ падпалкоўніка Галаскокава аб падзеях, якія яму давялося перажыць у час знаходжання на афганскай зямлі.***

Удзельнічаць у баях з духамі (так называюць нашы ваеннаслужачыя душманаў) мне давялося шмат разоў. Раскажу толькі аб адной аперацыі, якая праводзілася на паўднёвым усходзе Афганістана.

Атрымаўшы загад, мы пачалі рыхтавацца да паходу. Старанна правяралі зброю і тэхніку, харчовыя запасы. Клапаціліся аб вадзе – яна ў ДРА вялікі дэфіцыт, асабліва ў час аперацый. Нам прадстаяла ісці ў «зялёную зону». Ад самой назвы гэтай ужо рабілася непрыемна. Там у любы момант можна чакаць нападзення. Мой механік Алег Галавачоў выказаўся, помню, так: «Ну што, камандзір, пачастуем іх, як трэба. Вядома, прыдзецца цяжка, ды і горы крутыя. Дарог наогул няма…»

Пайшлі. Калону танкаў, аўтамабіляў, БТР відаць здалёку. Гэта і не дзіўна – пыл пры руху ўзнімаецца на сотні метраў у вышыню. Нясцерпна паліць белае сонца афгана, аж коле скуру нябачнымі стрэламі. Твар раз’ядае пот. Рухаемся марудна, таму што машыну, якая ідзе наперадзе, нябачна ўжо ў трох кроках. Прагрымеў дзесьці выбух, гэта падарвалася адна з нашых машын на міне, устаноўленай душманамі. Да яе адразу ж спяшаюцца рамонтнікі.

Да ночы дабіраемся да Гардэза. Марудзіць нельга, трэба праверыць машыны. Як толькі яны вытрымліваюць – гарачыню, пыл. І ідуць, і ідуць.

Вячэраем, і ў гэты час начальнік артылерыі палка маёр Радзько дзеліцца вельмі непрыемнымі ўражаннямі аб сваім ранейшым знаходжанні ў гэтых месцах. Рыхтавацца да сустрэчы з ворагамі пачынаем моўчкі. Кожны ў сваёй машыне яшчэ раз правярае і аглядае зброю і боепрыпасы. Кожны кладзецца спаць з няпростымі думкамі. Думаць ёсці аб чым – у чужым і невядомым краі прадстаіць сустрэча з ворагам твар да твару.

Ноч была турботная. Пастрэльвалі душманы з кулямётаў і мінамётаў, напамінаючы аб сабе. А ледзьве пачало світаць – крануліся ў шлях.

Нас праводзіў Гардэз, які ўжо абудзіўся ад сну. За калонай беглі афганскія дзеці. Затрымлівацца было нельга, а таму на хаду мы частавалі іх, чым маглі, – дасі бляшанку кансерваў, і яны, нібы тыя вераб’і, злятаюцца да яе.

Прыгарад прайшлі бясшумна, але насустрач ужо ўсё часцей пачалі трапляцца машыны з параненымі афганцамі з цырандоя. Значыць, наперадзе ідзе бой. Паабапал дарогі мы бачылі разбураныя дамы (так і не назавеш іх – цэлыя крэпасці), згарэўшыя дуканы, пакінутыя палі і вінаграднікі.

Але вось і «зялёная зона» – трэба быць максімальна асцярожнымі. Грыша Радзько па рацыі перадаў – зараз будзе горача. Да нас ужо набліжаліся парамі верталёты, страляла

артылерыя, закруціла карусель «вяртушка». Побач з дарогай задыміліся дзве машыны. Пачалі рвацца міны, засвісталі кулі.

«Дзмітравіч, – перадаў Алег, – вунь бачыш крэпасць? Духі адтуль б'юць. Адчыні ім дзверы».

З першага трапнага стрэлу вылецелі дзверы крэпасці, і адтуль па аднаму пабеглі духі да бліжэйшага яра.

Бой пачаў набіраць сілу. Нашу калону душманы разарвалі на дзве часткі, паспелі замініраваць дарогу, і цяпер абстрэльвалі нас з пакінутага кішлака. Перад танкам падскоквалі фантанчыкі пылу. Ну адкуль жа ён б'е? Нарэшце заўважылі, што душманы сядзяць у кронах дрэў. «Ну што ж, душман, атрымай бакшыш!» – і зарадзілі пушку асколачным снарадам.

Нескалькі мінут маўчалі духі, але потым бой разгарэўся з новай сілай. Ніяк не хацелі яны прапускаць калону праз рэчку, білі з гранатамётаў. Бачна было, што адчувалі душманы сваю сілу і ўпэўненасць. Мы на адкрытым полі, а яны ў «зялёнцы». І ніяк іх не дастаць. добра было бачна, як перацягвалі духі параненых і забітых.

Устанавілі назіранне. Каля гадзіны было ціха, але вось з'явіўся атрад з шасці чалавек, ідуць спакойна. Буры (БОР-303 англійскай вытворчасці) нясуць, як пастухі палку. Старэйшы групы штосьці тлумачыць. Добра бачныя яго цёмна-сіняе адзенне і чалма.

Атрад зайшоў за кусты. Гэтага нам і трэба. «Асколачнымі два снарада – заражай!» Хутка справіўся зараджаючы. Выстрал – і над кустамі толькі пыл узняўся, выскачыў як апантаны душман, стаў у разгубленасці без зброі. Другім стрэлам накрылі астатніх.

Так працягвалася да вечара, і ўрэшце бой быў пераломлены ў нашу карысць.

Крануліся ў шлях. Да ночы дабраліся да цясніны, і ў гэты час у хвост калоны зноў ударылі душманы. Было вельмі непрыемна заставацца ў цясніне на невялічкім участку пры скучанасці тэхнікі. Спалі прама ў машынах, а раніцой ужо ўся калона пачала ўцягвацца ў цясніну. Вось тут і прыйшлося ўпэўніцца, што нават танк можа быць бяссільным супраць праціўніка. Цясніна, высокія і крутыя схілы. У такіх умовах пушка не падымаецца вышэй сярэдзіны гары. Няма манеўра і схавацца можна толькі за бранёй. Праўда, да паўдня толькі зрэдку пастрэльвалі на пастах. Здавалася, наўкол адносна спакойна, але на душы было непрыемна.

Пачалося, як толькі крануліся пасля абеду. З гор ударылі душманы, ды такім шчырым агнём, што загарэліся адразу дзве нашы машыны. Як назло заклініў ДШК (буйнакаліберны кулямёт). Развярнуць машыну і вывесці яе з-пад абстрэлу, не стварыўшы пробку, было немагчыма. Уся надзея на аўтамат. Што толькі не перадумаеш у такія кароткія імгненні. Заўважыў, што аўтамат у руках «плавае», і з рук тоненькім струменьчыкам сцякае пот.

Артылерысты першымі прышлі ў сябе і пачалі абстрэльваць вяршыні гор. Тут і верталёты падаспелі.

Адагнаўшы душманаў, падышлі да кішлака – бачым, танк гарыць. Здавалася б, адно жалеза, а гарыць і гарыць. З кукурузы і дамоў пачалі пастрэльваць духі. Адказалі суцэльным агнём – сцяблы кукурузы падалі, як скошаныя…

Трэба было спяшацца – яшчэ палову цясніны не прайшлі. Доўга паўзлі па серпанціну дарогі да перавала, потым не менш марудна спускаліся ўніз. Нарэшце дайшлі. Заснулі як забітыя. Толькі часавыя не змыкалі вачэй.

Раніцай – усе на нагах, усё ў руху. Наперадзе высокія горы з кедрачом і душманскі вучэбны цэнтр у кішлаку Муні. Цяжка прыйшлося нашым хлопцам. Але на вайне як на вайне. мне давялося

дзяжурыць на сувязі і ахоўваць батарэю. Інфармацыя, атрыманая з перадавой дазваляла быць у курсе ўсіх падзей.

Акапаліся душманы капітальна, па ўсіх правілах ваеннай навукі. Вядома, саветнікі – французскія, амерыканскія – вучылі добрасумленна, вымуштравалі, як след. І ўсё ж духі адыходзілі. З'явіліся першыя палонныя, якія далі каштоўныя звесткі.

Марудна рухаліся часці. Вельмі многае зрабілі нашы сапёры і галоўныя іх памочнікі – сабакі, якія беспамылкова знаходзілі міны. Толькі праз тыдзень была ачышчана цясніна ад мін і душманаў.

Загад атрымаў – вывесці бронегрупу праз цясніну да кішлака Джаджы. Сабраліся хутка. Толькі крануліся – пайшоў дождж, у рацэ паднялася на паўтара метра вада. Рухаліся марудна. У скалах і на скалах – быўшыя пазіцыі душманаў, выкладзеныя з камянёў. Дык вось, дзе яны хаваліся, вось, дзе была засада.

Выйшлі да Джаджы, але да гэтага моцная сутычка была. Душманы не вытрымалі, адышлі ў лес.

А задачу мы яшчэ не выканалі – не дастаўлены прадукты харчавання для афганскіх войск і царандоя. Перашкаджаюць дождж і душманы, якія зноў прарываюцца да цясніны. Занялі абарону. Высоты па некалькі разоў у дзень пераходзілі з рук у рукі. Душманы дзейнічалі нахабна. Ім дапамагае і добрае веданне мясцовасці, і лес, які хавае ад назіральнікаў.

Некалькі разоў прылятаілі самалёты, бамбілі душманскія пазіцыі, але ў гарах вельмі цяжка знішчаць агнявыя кропкі. Здаецца, накрылі, а праз некаторы час зноў б'юць адтуль.

Асабліва горача прыйшлося на наступны дзень. Мінамёты і ДШК білі па штабу і па лагеру. Асабліва шалелі, калі садзіліся нашы верталёты. Кулі разрываліся побач з танкам і так балюча секла каменьчыкамі па твару, руках, аж слёзы выступалі на вачах. Але паспявалі нырнудь пад танк, ва ўкрыцце.

І ўсё ж мы вылічылі, дзе варожы мінамёт і ДШК. Накрылі назаўсёды гэтыя агнявыя кропкі.

...Ужо месяц, як мы ў гарах. Прадукты харчавання і боепрыпасы на зыходзе. Ды і пастаўленая задача выканана. Трафеі багатыя. Некалькі вучэбных цэнтраў душманаў разгромлены. Пахіснулі прэстыж духаў – выгналі іх у Пакістан. Ён жа побач, там, за гарой. Але і самім давялося перажыць нямала.

Нарэшце рушылі назад, у свой лагер. Ліў і ліў дождж. Дзесьці далёка наперадзе гучала кананада. Здзіўляла, што нашы маўчаць. Потым зразумелі – гэта рвуцца трапіўшыя ў вадаварот міны. Выпадковасць дапамагла нам.

І зноў быў нялёгкі шлях па цясніне. Ішлі з баямі трое сутак. Абстрэлы, завалы зробленыя душманамі ў вузкіх месцах. Аднойчы ўбачыў духаў так блізка, што нават не зразумеў, як яны трапілі на нашы пазіцыі...

Душманы зноў разарвалі калону – частка нашых засталася ў цясніне. Раніцай пайшлі ім на выручку. Зноў, як і раней, дапамагалі самалёты і верталёты. Да паўдня ўсё было скончана.

Самае цяжкае засталося ззаду. Але яшчэ два дні рыхтаваліся да таго, каб зрабіць апошні кідок да свайго асноўнага лагера.

Як бясконцая жалезная змяя выцягнулася калона. Ішлі па бездарожжу. Але правільна кажуць, што дадому і коні хутчэй бягуць. Так і на гэты раз. Ды толькі не пусцілі нас душманы бесперашкодна праз Карабах. Вось праклятае месца, 20 кіламетраў мінных палёў, «зялёная зона».

Вырашылі не рызыкаваць – спыніліся на начлег. Хутка прывялі двух душманаў – мініравалі дарогу процітранспартнымі мінамі італьянскай вытворчасці. Наогул жа ноч мінула спакойна. А раніцай прайшлі праклятае месца без страт.

На базе чакалі размовы, сябры, і вядома, руская лазня – кавалачак нашай рускай традыцыі. Потым была вячэра, тэлевізар, які так рэдка даводзілася бачыць. Не было толькі расслаблення. Памяталі – заўсёды трэба быць гатовым да адбіцця праціўніка.

Вось і ўвесь расказ аб адной аперацыі, якая прадаўжалася 45 сутак.

**В. Галаскокаў**